**Тухта, В.** Першы з чорнага спісу ахвяраў афганскай вайны / В. Тухта // Лепельскі край. – 2021. — 12 лют. — С. 8.

**ПЕРШЫ З ЧОРНАГА СПІСУ АХВЯРАЎ АФГАНСКАЙ ВАЙНЫ**

***Сяргей АЎТУХ нарадзіўся ў вёсцы Кабак Лепельскага раёна. Увесну 1981-га юнак быў прызваны ў Савецкую армію і накіраваны ў Афганістан. Службу праходзіў на пасадзе старшага кіроўцы ўзвода забеспячэння. Загінуў у баі 18 лютага 1983 года каля населенага пункта Балх. Пахаваны на радзіме, у вёсцы Кабак. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.***

З першых дзён знаходжання ў войску Сяргей пасябраваў са Станіславам Ставіцкім. У далейшым хлопцы праходзілі службу ў Афганістане ў адным падраздзяленні. Station. Станіслаў, як ніхто іншы, ведаў падрабязнасці службы Сяргея Аўтуха і абставіны яго гібелі.



**Сяргей Аўтух падчас службы**

З успамінаў Станіслава Ставіцкага: «30 сакавіка 1981 года Сяргей прайшоў медкамісію ў Віцебскім аблваенкамаце. Увечары на цягніку накіравалі ў Мінск, раніцай 31 сакавіка 1981 года – на электрычцы – ў Мар’іну Горку, на перасылку. Пераапранулі.

5 красавіка пасадзілі ўсіх у эшалон і павезлі ў Сярэднюю Азію. У Тэрмез прыехалі 10-га красавіка. Нас, беларусаў, адабралі 25 чалавек, у тым ліку і Сяргея Аўтуха. Трапілі ў каменданцкую роту.

10 чэрвеня 10 нашых хлопцаў адправілі ў «вучэбку» ў Ашхабад. Нам, 8 чалавекам, якія засталіся ў вучэбным палку, паведамілі, што пойдзем у Афганістан.

20 чэрвеня 1981 года пешшу дайшлі да савецка-афганскай мяжы. Потым пасадзілі на «Уралы» і павезлі ў Афганістан. Прыбылі ў Ташкурганскі 122-гі мотастралковы полк. Сяргей Аўтух, Глеб Мароз і я трапілі ва ўзвод забеспячэння. Сяргей працаваў на бензавозе, мы з Глебам – на бартавых «Уралах».

З першых дзён даводзілася несалодка, траплялі пад абстрэлы. Наш батальён стаяў у горадзе Айбак, правінцыя Саманган.

Сяргей пастаянна дастаўляў паліва ў батальён і развозіў па ротах, быў запраўшчыкам. Калі выездаў не мелася, прасіўся ў суправаджэнне калон. Не любіў сядзець на месцы. У канцы жніўня 1982-га года наш батальён зрабілі аператыўным і перавялі ў горад Ташкурган, на поўнач Афганістана.

Да Новага года нікуды не ездзілі, а вось у пачатку 1983 года пачаліся баявыя аперацыі. Да мая Сяргей Аўтух быў на адным заданні разам з намі, вазіў паліва. Потым яго адправілі ў камандзіроўку ў Шыберган, дзе стаяла чацвётрая рота. Ён дастаўляў туды паліва. У мясцовасці Балх вельмі часта нашы калоны траплялі пад абстрэл. Мы толькі прыбылі з чарговай аперацыі, і Сяргей прыехаў у полк. У апошні вечар ён быў вельмі вясёлы, жартаваў, прасіў хлопцаў пайграць на гітары. Нампатэх папрасіў Сяргея ажыццявіць яшчэ адзін рэйс у Шыберган.

18 лютага 1983 года, Сяргей, ціхенька падняўся ў 4 гадзіны раніцы і накіраваўся ў парк за сваім бензавозам. Мы спалі з Сяргеем на здвоеным ложку. Звычайна я чуў, калі хтосьці прачынаецца, а тут – не. Не змог нават развітацца з ім. Каля 6 гадзін раніцы калона сышла ў Шыберган і Джаркудук. У Мазары-Шарыфе калона адзначалася на афганскім КПП, іх папрасілі ўзяць у калону афганскі аўтобус. Аўтобус пайшоў наперадзе, калі даехалі да мясцовасці Балх, калону абстралялі, пачаўся бой. У калоне ішлі «Уралы», БТРы і танкі. Танкі крыху адсталі ад асноўнай калоны. Калі яны падышлі, некаторая тэхніка ўжо

была падбітая. Сяргей пакінуў бензавоз і пачаў адстрэльвацца з аўтамата. Атака была адбіта, але пры адыходзе куля смяротна параніла Сяргея. У гэтым баі загінулі шэсць чалавек, таксама быў адзін паранены.

1 ліпеня 1983 года некалькі нашых хлопцаў пабывалі на магіле сябра Сяргея Аўтуха ў вёсцы Кабак. Там іх сустрэлі маці загінулага таварыша Антаніна Фамінічна і сваякі. Як жа шмат перажыла гэта жанчына, калі Сяргей служыў у Афганістане, колькі слёз праліла пасля пахавання сына!»



**Баявыя таварышы і маці Сяргея Аўтуха Антаніна Фамінічна на яго магіле**

Вось што пра абставіны гібелі Сяргея распавядае яшчэ адзін яго саслужывец Мікалай Рачыцкі: «... Вельмі шмат куль трапіла ў машыну, Сяргей быў паранены. Старшы лейтэнант Дусь хацеў выцягнуць яго з кабіны і паспеў гэта зрабіць, але аўтаматная чарга прашыла іх насмерць...». Сяргей Аўтух загінуў у апошнія дні службы. Варожая куля абарвала маладое жыццё. Хлопец стаў першым у чорным спісе ахвяраў гэтай вайны, якая забрала жыцці васьмі лепяльчан.

**ВалерыйТУХТА**